Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Смерць нямецкім акупантам!

# Калгаснік Капыльшчыны

№ 15 (1768) АУТОРАК 4 красавіка 1944 г.

**За мінулы месяц у раёне сабрана аблігацый на суму 62.215 рублёў і 210 рублёў золатам—на пабудову танкавых калон і эскадрылій самалётаў для Чырвонай Арміі.**

**Працоўныя раёна! Уносце свае сродкі у фонд Чырвонай Арміі!**

Орган Капыльскага РК КП(б)Б.

## ЗА ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ 1-га МАЯ

Совецкія людзі маюць выдатную традыцыю—усе свае вялікія святы адзначаць новымі поспехамі і перамогамі. Гэтая традыцыя асабліва укаранілася у дні Айчыннай вайны. Кожны совецкі чалавек, дзе-б ён не знаходзіўся—у тылу, ці на фронце, прыкладае усе свае сілы, каб прыблізіць час канчатковай перамогі над заклятым ворагам усяго чалавецтва—нямецкім фашызмам.

Па усёй нашай краіне зараз разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 1-га Мая—вялікага свята працоўных усяго свету. Рабочыя ваенных заводаў бяруць абавязацельства даць Чырвонай Арміі звыш плана новыя сотні і тысячы танкаў, самалётаў, гармат і іншага узбраення; шахцёры і металургі абавязуюцца даць краіне новыя тысячы тон вугля і метала; будаўнікі датэрмінова заканчваюць будаўніцтва новых і аднаўленне разрушаных заводаў, шахт і домнаў; калгаснае сялянства прыкладае усе сілы, каб паспяхова правесці веснавы сеў, дабіцца высокага ураджаю, поўнасцю забяспечыць Чырвоную Армію і горад прадуктамі, а прамысловасць—сыравінай.

Усё для фронта, усё для перамогі!—пад такім лозунгам кіпіць работа совецкага тыла.

Чырвоная Армія, апіраючыся на усенародную падтрымку, стала самай магутнай арміяй у свеце, і яна цяпер наносіць смяротныя удары па нямецка-фашысцкіх захопніках, вядзе грандыёзныя бітвы за поўнае ачышчэнне совецкай зямлі ад фашысцкай навалы.

Совецкая краіна сустракае свой трэці ваенны першамай у абстаноўцы яркага зіяння вялікіх перамог Чырвонай Арміі. Немалую дапамогу у дасягненні гэтых перамог Чырвонай Арміі аказалі слаўныя совецкія партызаны. Усведамленне кожным партызанам таго, што і яго скромная доля ёсць у тых грандыёзных перамогах совецкіх войск, выклікае у яго сэрцы невыказна вялікую радасць і гордасць.

Працоўныя совецкай краіны і Чырвоная Армія накіроўваюць усе свае намаганні на тое, каб к дню 1-га Мая парадаваць увесь свет яшчэ большымі поспехамі і перамогамі над сусветным ворагам.

Мы, партызаны, таксама павінны уключыцца ва усенародны рух совецкіх людзей за дастойную сустрэчу 1-га Мая. У нас адна асноўная умова прадмайскага спаборніцтва—пабольш забіць нямецкіх гадаў, павялічыць свой баявы рахунак. Кожнае партызанскае падраздзяленне павінна прадумаць, чым адзначыць першамай. У гэтым рашаючая роль—уласная ініцыятыва кожнага народнага мсціўца.

**Партызаны і партызанкі!**

Уключайцеся у соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 1-га Мая. Пабольш пад адкос эшалонаў праціўніка, у паветра нямецкія аўтамашыны, склады і масты!

Не даць магчымасці ворагу пры адступленні грабіць і паліць нашы вёскі, ганяць совецкіх людзей на катаргу у Германію—гэта будзе наш найлепшы першамайскі падарак.

## ПА СОВЕЦКАЙ КРАІНЕ

◆◆ Рабочы калектыў Чусаўскага завода у рапарце Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварышу Сталіну паведамляе аб пуску у ход на Чусаўскім заводзе першага бессемераўскага цэха на Урале. Апрача таго, на гэтым заводзе закончан мантаж новага магутнага канвертара. Новыя тысячы тон сталі атрымае наша краіна.

◆◆ Яшчэ не так даўно сцены карпусоў Сталінградскага металургічнага завода „Красны Окцябр" былі арэнай жорсткіх баёў, а сёння сталінградцы рапартуюць таварышу Сталіну аб аднаўленні і пуску металургічнага завода „Красны Окцябр".

Сталінградскі метал, выплаўлены ля берагоў Волгі, ужо абрушваецца на галавы ворага на беразе Прута.

◆◆ Калектыў Маскоўскага станкабудаўнічага завода „Красный Пролетарый" на старонках друку звярнуўся да усіх працоўных краіны з заклікам разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва у чэсць трэцяга ваеннага першамая. Заклік краснапралетарцаў знайшоў шырокі водгук па усёй краіне.

◆◆ На-днях адбылася гутарка карэспандэнта газеты „Красная звезда" з камандзірам польскай арміі у СССР генерал-лейтэнантам Зігмундам Берлінгам, які заявіў, што яшчэ зусім нядаўна налічвалася толькі адна польская дывізія у СССР, а цяпер ужо створана цэлая армія, у якую кожны дзень уліваюцца новыя тысячы польскіх патрыётаў. Польская армія у СССР цяпер гатова уступіць у барацьбу за вызваленне Польшчы ад нямецкіх акупантаў, за свабодную, дэмакратычную Польшчу

## ДА ЯПОНА-СОВЕЦКИХ АДНОСИН

30 сакавика заключана япона—совецкае пагадненне аб датэрминовай ликвидацыи японских канцэсий на Пауночным Сахалине и аб прадауженни рыбалоунай канвенцыи на 5 год. Згодна со вецка-японскага пагаднення 1928 года, японския канцэсии павинны были исневаць да 1970 года. Заключаным па прапанове совецкага урада 30 сакавика пагадненнем японския канцэсии ликвидаваны на 26 год раней тэрмину.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

29 сакавика войски 1-га Украинскага фронта, у выниху умелага манэура танкавых злучэнняу и пяхоты, авалодали горадам и буйным чыгуначным вузлом Каламыя—важным апорным пунктам немцау у прадгор'ях Карпат. 30 сакавика войски фронта фарсиравали раку Прут и штурмам авалодали абласным цэнтрам г. Чэрнавицы—важным гаспадарча-палитычным цэнтрам Пауночнай Букавины и магутным апорным пунктам абароны немцау на рацэ Прут, прыкрываючым подступы к границам Венгрыи и Румынии.

За час з 23 сакавика па 2 красавика войски 1-га Украинскага фронта, у рэзультаце наступальных баёу, авалодали раёнными цэнтрами Каменец-Падольскай областци Минькоуцы, Солобкоуцы, Старая Ушыца, г. Дунаеуцы; Винницкай вобласци — горадам Бар; Тарнопальскай области —Пэдгайцы, Станиславускай вобласци—г. Гвяздзец, Тлумач, Тысмяница, Надворное, Деляцин, Обэртин, Заболатау, Синяцин, г. Косоу, г. Куты; Чэрнавицкай вобласци—г. Кицмань, Кельменцы, г. Старажынец, г. Генца, Новоселица.

Войски 2-га Украинскага фронта за час з 23 сакавика па 2 красавика авалодали раёнными цэнтрами Малдаускай ССР Кишкарэни, Сэнджарэй, Кацюжаны, г. Липканы, г. Рыбница.

Войски 3-га Украинскага фронта 28 сакавика, пасля упорных баёу, штурмам авалодали буйным абласным и прамысловым цэнтрам Украины горадам Никалаеу—важным чыгуначным вузлом, адным з буйнейшых партоу на Чорным моры и моцным апорным пунктам абароны немцау у низоуи Паудзёвага Буга. Развиваючы наступленне, войски фронта 30 сакавика фарсиравали раку Паудзёвы Буг и Бугски лиман и авалодали райцэнтрам Никалаеускай вобласци г. Варвараука, а 31 сакавика авалодали крэпасцю и горадам Очакоу—важным апорным пунктам абароны немцау, запираючым уход у Днепра-Бугски лиман.

Нашы войски, наступаючыя на захад и паудзёвы захад ад горада Пэрвамайск, авалодали райцэнтрами Одэскай вобласци г. Балта, Крывое Возера, Больщая Владзиоука, Любашэука.

Совецкия войски, наступаючыя на пауночны захад, захад и паудзёвы захад ад горада Вазнесенск, авалодали райцэнтрами Одэскай обл. Доманеука, Мастовое, Веселиново.

З 31 сакавика па 3 красавика нашы войски вяли наступальныя баи на Кишынеуским, Тираспальскім и Одэским напрамках и у ходзе баёу авалодали райцэнтрами Одэскай обл. г. Котовск, г. Ананьеу, Андрэева-Иванаука, г. Беразоука, Троицкое, г. Ширяева, Красные Окна, Вялизгацулава, Жовцэнь; Никалаеускай обл. Тэлигула-Березанка (Суворава), райцэнтрам Малдаускай ССР г. Рэзина.

На працягу 3 красавика нашы войски вяли наступальныя баи на захад и паудзёвы захад ад горада Дубно и авалодали райцэнтрами Валынскай обл. г. Горохоу, г. Берэсцечко, райцэнтрам Львоускай обл. Лявэцин, а таксама занялі больш 30 других населеных пунктау.

Некальки дзён назад войски 2-га Украинскага фронта на радзе участкау фарсиравали раку Прут, заняли на румынскай тэрыторыи больш 50 населеных пунктау и чыгуначную станцыю Дзяжэний, перарэзаушы, такім чынам, чыгунку Ясы-Дорохой.

## Баявы рахунак атрад[a] за месяц

У сакавику месяцы баг[...] и усебакова была баяв[...] дзейнасць атрада, дзе кам[...] дзирам Алесь К. и камис[...] рам Никалай О. За месяц [...] радам знишчана 186 гит[...] раўцау, 73 ранена, 2 нем[...] захоплены у палон. Спущ[...] ны пад адкос 3 эшалоны [...] цивника з жывой силай, т[...] никай и стройматар'яла[...] У выниху крушэнняу ра[...] ты 3 паравозы, 22 вагоны, [...] бита и ранена 208 немцу[...] Атрадам падарваны 3 ау[...] машыны, 143 рэйки; знищ[...] на 12,3 клм. тэлефонна-[...] леграфнай линии сувязи, с[...] лена мельница, якая абслу[...] вала гарнизон працивника.

Н. Лявоны.

## Знялі часавых и навяза[...] бой гарнизону

Група партызан Н-скага [...] рада на чале з таварыш[...] З., будучы у камандыроу[...] у раёне гарнизона С., 1 к[...] савика зняла двух часав[...] немцау, а таксама абстр[...] ла групу нямецких сал[...] на чыгунцы. Гэтым сам[...] народныя мсцицуцы навяза[...] бой усяму гарнизону, а [...] тым удачна адышли. У [...] нику перастрэлки были [...] биты яшчэ 4 немцы и [...] ранен.

И. Падгорны.

## Не ўцалеў ни адзин нем[...]

Раницай 28 сакавика гру[...] партызан Н-скага атр[...] (старшы таварыш Н.) на [...] розе Коласава — Негарэл[...] узарвала нямецкую аут[...] шыну з жывой силай. Узр[...] быу таки моцны, што ма[...] ну разнесла ушчэпки, за[...] ла 13 и ранила 18 нямецк[...] салдат и афицэрау. Ад уз[...] ву ни адзин немец не аст[...] ся непашкоджаным.

Алесь Я[...]

## Узарвали 14 аўтамашы[...]

14 аутамашыны узарвали [...] минулым месяцы партыза[...] Н-скага атрада. Забита [...] гитлерауцау. Акрамя та[...] знишчана 11 километрау [...] вязи.